# Пачынаецца новы этап уступнай кампаніі

Сёлета па ўсіх прадметах цэнтралізаванага тэсціравання, акрамя матэматыкі, фізікі, рускай і беларускай моў, за сямібальным парогам аказаўся менш як 1% абітурыентаў гэтага года. У той жа час на ЦТ па рускай мове парог не пераадолелі больш як 3,4 тысячы чалавек (3,67%), па беларускай — больш як 1,1 тысячы (2,65%), па фізіцы — больш як 3,9 тысячы (9%), па матэматыцы — больш як 11 тысяч (11,27%). Адзначым таксама, што 852 абітурыенты не атрымалі на ЦТ ніводнага бала, прычым большасць (796) — па матэматыцы.

Зрэшты, пакуль немагчыма сказаць, колькі дакладна абітурыентаў засталося за сямібальным парогам, бо, напэўна, ёсць людзі, якія здалі менш, чым на сямёрку, не адзін, а два ці нават тры тэсты. Сёлета яны не змогуць падаць дакументы ў ВНУ, але пры наяўнасці двух сертыфікатаў ім не забараняецца паступаць ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Як добрую навіну трэба ўспрымаць той факт, што ўдвая ў параўнанні з мінулым годам вырасла колькасць стабальных вынікаў — 123, і большасць з іх — па матэматыцы (46).

Згодна з графікам, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў ужо пачаў перадачу сертыфікатаў у пункты цэнтралізаванага тэсціравання. Іх выдача абітурыентам пачнецца ў найбліжэйшыя дні.

Нагадаем, што 9 ліпеня, у панядзелак, пачынаецца прыём дакументаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы сілавых ведамстваў і Міністэрства культуры. Дакументы на ўсе формы атрымання адукацыі ў Акадэмію МУС, Ваенную акадэмію, Камандна-інжынерны інстытут МНС і Гомельскі інжынерны інстытут МНС абітурыенты могуць падаваць з 9 па 15 ліпеня. Тыя, хто вытрымае ўступныя іспыты, але не пройдзе па конкурсе на дзённую бюджэтную форму навучання, маюць права ўдзельнічаць у конкурсе ў гэтай жа ВНУ на завочную і вячэрнюю бюджэтныя формы навучання. Перанакіраваць дакументы можна будзе па 21 ліпеня. Тыя, хто вытрымае ўступныя іспыты, але не пройдзе па конкурсе на бюджэтную форму навучання, могуць падаць дакументы на платнае аддзяленне да 23 ліпеня.

Абітурыенты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў могуць падаць дакументы на дзённую бюджэтную форму навучання ў гэтыя навучальныя ўстановы з 9 па 13 ліпеня; на завочную і вячэрнюю (бюджэт) — да 25 ліпеня; на платнае аддзяленне — да 27 ліпеня.

Нагадваем, што ў апошні дзень прыёму дакументаў інфармаванне абітурыентаў аб ходзе прыёму спыняецца ў 15.00. Допуск у будынак установы адукацыі, у якім размяшчаецца прыёмная камісія, завяршаецца ў 18.00. Адначасова прыёмная камісія спыняе выдачу дакументаў абітурыентам з мэтай іх падачы на іншую спецыяльнасць, пры гэтым забяспечвае прыём дакументаў ад усіх абітурыентаў, якія знаходзяцца ў будынку ВНУ.

**Падрыхтавала**
**Галіна СІДАРОВІЧ.**
*sidarovich@ng-press.by*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ